# ГІСТАРЫЧНЫЯ КОРНІ БЕЛАРУСКАГА ЭТНАСУ

А.В.Клімянкова

Навуковы кіраўнік – прафесар В.М.Калмыкоў

(гісторыка-юрыдычны факультэт)

Менталітэт азначае канцэнтраванае выяўленне духоўнага укладу этнасу /асаблівасці псіхічнага складу этнасу, узровень і спосабы выражэння яго нацыянальнай самасвядомасці, тыповыя рысы яго нацыянальнага характару, якія выяўляюцца ў паводзінах прадстаўнікоў этнасу/, асобны склад мыслення, пачуццева-вобразнага адчування. Менталітэт з'яўляецца інтэгральным грунтам нацыянальнай культуры і фарміруецца пад уздзеяннем шэрагу фактараў.

Беларусы з'явіліся вынікам славяна-балцкага сінтэзу. Адсюль і сходнасць рыс характару беларусаў, літоўцаў: талерантнасць, гасціннасць, мяккасць. Праз усю гісторыю можна прасачыць беларуска-скандынаўскія сувязі.

Асновы характару продкаў беларусаў пачалі закладваецца ў дахрысціянскія часы, а працягвалі фарміравацца ўжо ў перыяд хрысціянства. Негвалтовасць, паступовасць хрышчэння абумовілі сінтэз язычніцкай цягавітасці, трываласці, настойлівасці, ганарлівасці і хрысціянскай мяккасці, дабразычлівасці, спагадлівасці. Беларускі менталітэт на працягу многіх стагодзяў заставаўся, па сутнасці, дахрысціянскім, язычніцкім, пра што сведчыць і спецыфіка многіх народных звычаяў, традыцый, абрадаў правядзення асобных святаў і прысвятаў.

Перыпетыі гістарычнага лесу беларускага народа абумовілі адкрытасць яго культуры да розных паветаў, своеасаблівую культурную талерантнасць. Увогуле, па меры развіцця агульнацывілізацыйных працэсаў /рынчных адносін, дэмакратыі і г.д./ выключныя рысы кожнага этнасу і кожнай цывілізацыі будуць размывацца і ўзмацняцца агульныя, уласцівыя усім нацыям і народам. Але гэта не выключае праявы самабытнасці і унікальнасці этнасу. Здаўна беларусы атаясамлялі сябе як бы з падвоеным грамадзянствам: рускі, праваслаўны і беларусец-ліцвін. Але стрыжань іх менталітэту складала адвечная прага да адраджэння свайго краю, спрадвечнае ж жаданне-захаваць сваю самастойнасць. Усе гэта нарадзіла паняцце "літоўскага сепаратызму" і беларускай нацыянальнай ідэі, якое хваравіта абвастрылася ў складаных абставінах.

На складванне асаблівасцей менталітэту ўплывае і прыродна-геаграфічны фактар. Праназірана, што жыхары раўнiннай мясцовасці

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

маюць больш мяккі, лагодны характар. Нават у самой Беларусі актыўныя, гаваркія, крыху скупаватыя жыхары пагоркавых Цэнтру і Поўначы адрозніваюцца ад павольных, памяркоўных, больш сціплых, адкрытых палешукоў. Але, увогуле, спецыфіка беларускай прыроды, рассяленне жыхароў нашай Бацькаўшчыны прымацоўвала беларусаў да свайго кавалачка зямлі. Іх называлі яшчэ "земляной нацыяй". Усе гэта абумовіла наяўнасць надзвычнага патрыятызму, балючасці за родны край, паэтычнасць душы. Але, з другога боку, гэткая прывязнасць нараджала канфармізм, прастату, часам абыякавасць, звычку жыць на "авось".

Асаблівасцю беларускага менталітэту з'яуляецца тое, што загартаўваўся ен у даволі складаных сацыяльна-палітычных абставінах. За чатыры апошнія стагоддзі Беларусь страціла пятнаццаць мільенаў чалавек, галоўнае – сваю эліту. Не апошнюю ролю адыгралі працяглая адсутнасць у мінулым сваей нацыянальнай дзяржаўнасці, несупынныя працэсы дэнацыялізацыі /паланізацыя, русіфікацыя/, канфесійная размежаванасць беларускага этнасу /каталіцтва, праваслаўе, уніяцтва/, позняе фарміраванне і нязначны лік нацыянальнай інтэлігенцыі, адносна нізкі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, а ў савецкі час ідэалогія і практыка "контрбеларусізацыі".

Беларуская нацыянальная ідэя – гэта адмауленне крайніх формаў усходняга "візантызму" /унітарнасці грамацка-палітычнага жыцця, нецярпімасці да іншадумання, экспансіі, канцэнтрацыі ўлады ў адных руках/ і заходняга індывідуалізму /тэндэнцыі ўплыву і асіміляцыі слабейшых народаў/. Яна спалучае і сінтэзуе лепшыя бакі двух аснаўных тыпаў цывілізацый.

Існуе думка, што ўсходне-славянскі рэгіен /Расія, Беларусь, Украіна/ на этапе антрапагеннай цывілізацыі адыгрываючы ролю пасрэдніка паміж Ўсходам і Захадам, пераадолее аднабокавасць абедзвух цывілізацый і іх тыпаў развіцця і прывядзе чалавецтва да сінтазу рацыянальнага і духоўнага пачаткаў, тым самым славянства мае мажлівасць адыграць вядучую ролю на новым павароце развіцця ўсеагульнай цывілізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ